# ПАЛІТАЛОГІЯ

Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 1. С. 5–17

*УДК 94(476):001.1*

## ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК: ДА 100-ГОДДЗЯ ІНСТЫТУТА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

**І. І. Шаўчук,**
*доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна;*

**Г. У. Карзенка,**
*доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных дысціплін Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 27.01.22.

*UDC 94(476): 001.1*

## ORIGINS OF THE BELARUSIAN ACADEMY OF SCIENCES: TO THE 100TH ANNIVERSARY OF THE INSTITUTE OF BELARUSIAN CULTURE

**I. Shauchuk,**
*Doctor of History, Associate Professor, Professor of the Department of General History, Brest State University named after A. Pushkin;*

**G. Karzenka,**
*Doctor of History, Professor, Professor of the Department of Social-Humanitarian Disciplines, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 27.01.22

Разглядаецца гісторыя Інстытута беларускай культуры і яго пераўтварэння ў Беларускую акадэмію навук у айчыннай гістарыяграфіі. Да сённяшняга дня канстатуецца наяўнасць канцэптуальнай «салідарнасці» да- і пасляваенных даследчыкаў пры асвятленні пачатковага перыяду інстытуалізацыі акадэмічнай навукі ў Беларусі. Аўтары з дапамогай сучасных літаратурных і дакументальных крыніц па-новаму разглядаюць гэты складаны працэс. Пазначаны этапы, палітыка-ідэалагічныя, эканамічныя і навукова-арганізайныя фактары, якія стрымлівалі рэарганізацыю, структурную перабудову ІБК у акадэмічную ўстанову.

*Ключавыя словы:* Інстытут беларускай культуры, Акадэмія навук, статуты, навукова-арганізацыйнае будаўніцтва, развіццё.

The history of the Institute of Belarusian Culture and its transformation into Belarusian academy of sciences is considered in domestic historiography. Up to the present time the presence of conceptual “solidarity” of pre- and postwar researchers on elucidation of the initial period of academic science institutionalization in Belarus. With the help of modern literary and documentary sources the authors consider this complicated process in a new way. We identified the stages, political-ideological, economic and scientific-organizational factors that used to hinder reorganization, structural rebuilding of IBC into an academic institution.

*Keywords:* Institute of Belarusian Culture, Academy of Sciences, statutes, scientific-organizational building, development.

Гісторыі Інстытута беларускай культуры (ІБК) айчыннай гістарыяграфіяй нададзена пэўная ўвага. Яна абумоўлена пераўтварэннем Інстытута ў Беларускую акадэмію навук (БАН). Але да сённяшняга дня можна канстатаваць наяўнасць канцэптуальнай «салідарнасць» поглядаў да- і пасляваенных аўтараў пры асвятленні пачатковага перыяду інстытуалізацыі акадэмічнай навукі ў Беларусі з пачатку 1920-х гг. Яны заключаюцца ў наступным: ІБК створаны *на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі* (Навуковая камісія па складанні і апрацоўцы беларускай тэрміналогіі, НТК; ІБК створаны *на пачатку 1922 г.* (*тут і далей курсіў аўтараў. –* І. Ш., Г. К.). Разам з тым, практычна не надаецца ўвага тым публікацыям 1920-х гг., якія адрозніваюцца ад дадзенай схемы. Напрыклад: «Інстытут Беларускай Культуры ... пачаў сваё існаванне на пачатку 1922 г., *замяніўшы сабой* Навукова-Тэрміналагічную Камісію» [1, с. 422], альбо «*Фактычна* ён (*ІБК.* – І. Ш., Г. К.) пераняў на сябе працу т. зв. «Навукова-тэрміналагічнай камісіі» [2, с. 113] і інш. У. М. Ігнатоўскі адзначаў, што у канцы 1921 г. ІБК пачаў *фактычнае існаванне*, *фармальна* ІБК замацоўваецца ў пачатку 1922 г. [3, с. 11, 12]. Вучоны сакратар Акадэмцэнтра М. М. Гуткоўскі ў кастрычніку 1921 г. адносіў да навуковых устаноў, адначасова з НТК, Інстытуты беларускай і яўрэйскай культуры [4, с.19].

Адносна часу *стварэння* Інбелкульта ў пасляваеннай навуковай літаратуры прысутнічае некалькі часам непраўдападобных пазіцый. Дамінуе меркаванне *пра пачатак яго*

*існавання* з 30 студзеня 1922 г., калі адбылося першае пасяджэнне (дакладней – 28–30 студзеня). Наступная па папулярнасці дата – 20 лютага таго ж году, на якую былі прызначаны ўрачыстасці, але адказныя работнікі НКА, у тым ліку наркам, на іх не з'явіліся, таму ўрачыстае адкрыццё не адбылося. Сустракаюцца таксама: 29 студзеня, 20 сакавіка (А. Ф. Мяснікоў) [5, с. 159,177]. Відавочна, што і грамадска-палітычная сітуацыя, і навукова-арганізацыйная, і даволі невялікая колькасць пакуль што выяўленага дакументальнага матэрыялу вымагаюць яго асабліва ўважлівага сэнсавага і тэкстуальнага аналізу.

Агульнавядома, што спробы аднаўлення навуковага цэнтра ў форме ўніверсітэта пасля 1832 г. рабіліся і ў XIX – пачатку XX ст., і ўрадам БНР, аднак рэалізацыя падобных планаў адбылася толькі пасля ўсталявання ў Беларусі савецкай улады. Зразумела, што пачаўся пошук шляхоў як непасрэднай арганізацыі навуковай і навукова-педагагічнай дзейнасці, так і кіраўніцтва ёю. Своеасаблівасць навукова-арганізацыйнай сітуацыі ў Беларусі вызначалася адсутнасцю навуковых устаноў. Гэта абумовіла перайманне большасці мерапрыемстваў, ажыццёўленых у Расіі. Хаця задачы, якія стаялі перад абедзвюма рэспублікамі адрозніваліся: у РСФСР адбываўся злом старых і пошук новых форм кіраўніцтва і забеспячэння дзейнасці навукі, а ў Беларусі – толькі закладанне яе арганізацыйных асноў.

У Расіі для арганізацыі навуковай дзейнасці на новых падставах у сакавіку 1918 г. быў створаны Навуковы аддзел Наркамата асветы [6, с. 28]. Па аналогіі ў Беларусі падобныя функцыі належалі НЛА НКА, што праіснаваў з 7 лютага да канца 1921 г. Паводле палажэння, аддзел павінны быў разглядаць усе пытанні навуковага і навукова-педагагічнага характару і даваць па ім свае заключэнні, прымаць навуковыя творы да друку. У адпаведнасці з задачамі аддзел падзяліўся на тры секцыі: навуковую, навукова-педагагічную і літаратурна-мастацкую. Пры ім дзейнічала яўрэйская навуковая секцыя. За час існавання НЛА яго Навуковая калегія (секцыя) разглядзела 43 рукапісы агульным аб'ёмам 352 друкаваныя аркушы і вырашыла набыць для выдання працы М. А. Янчука і У. І. Пічэты. Былі пастаўлены на абмеркаванне работы М. Доўнар-Запольскага; заказаны шэраг падручнікаў вядомым аўтарам; разгледжаны пытанні навукова-савецкага характару кшталту з'езда беларускіх навуковых сіл, Інбелкульта, краязнаўчай работы і інш. [7, арк. 9–9 адг.; арк. 34, с. 53]. Навуковая секцыя з самага пачатку вызначыла прыярытэтным напрамкам апрацоўку беларускай тэрміналогіі. У сувязі з гэтым пры НЛА «для чыста практычных мэтаў – складання тэрміналогіі» ствараецца Навукова-тэрміналагічная камісія (10 лютага зацверджаны статут, 20 лютага 1921 г. пачынаецца праца) [8, с. 280]. У справаздачах жа НКА сустракаецца інфармацыя пра пачатак рэальнай працы з 22 лютага, а прыродазнаўчай секцыі – з 24 [9, арк. 14, 15, 17].

Пры ўтварэнні НТК складалася з 13 чалавек, але на працягу першых 72-х дзён яе існавання колькасць членаў павялічылася да 15 [10, арк. 15]. Гэта можна ўбачыць са спісу супрацоўнікаў Акадэмічнага цэнтра на атрыманне пайкоў за ліпень 1921 г.: С. М. Некрашэвіч – старшыня, У. В. Чаржынскі – сакратар, члены – М. Я. Байкоў, Л. Л. Більдзюкевіч, Ф. Ф. Бурак, Л. У. Дашкевіч, Я. Л. Дыла, Я. П. Каранеўскі, А. П. Круталевіч, Я. Ю. Лёсік, І. Д. Луцэвіч, В. Ф. Міхальскі, К. М. Міцкевіч, Ч. І. Родзевіч, К. М. Цвірка-Годыцкі. Пазней, у кастрычніку, налічвалася 16 членаў камісіі. Справаздача аб дзейнасці Акадэмічнага цэнтра за 1921 г. таксама называе 16 прозвішчаў [11, арк. 5–5 адг.]. У гуманітарнай секцыі распрацоўкай тэрміналогіі займаліся І. Д. Луцэвіч (тэорыя славеснасці і літаратура), У. В. Чаржынскі (гістарычная тэрміналогія), Я. Ю. Лёсік (граматыка), М. Я. Байкоў (псіхалогія і логіка). У прыродазнаўчай – Я. П. Каранеўскі (заалогія), Ч. І. Родзевіч (хімія), В. Ф. Міхальскі (батаніка), Ф. Ф. Бурак і Л. У. Дашкевіч (фізіка), М. В. Азбукін (геаграфія) [12, арк. 17–17адг, с. 54]. У 1921 г. праведзена 188 секцыйных пасяджэнняў, дзе было прынята 5684 тэрміны, агульных пасяджэнняў камісіі – 106 і 2434 тэрміны. НТК надрукавала тэрміналогіі граматыкі і логікі, апрацавала ў канчатковай форме тэрміналогіі арыфметыкі, алгебры, вышэйшага матаналізу і інш. [13, с. 54].

У чэрвені 1921 г. адбылася рэарганізацыя НКА. Пры ім па расійскай аналогіі толькі з паўгадавым спазненнем ствараецца Акадэмічны цэнтр, асновай якога стаў НЛА. Праца па арганізацыі АЦ пачынаецца з 27 чэрвеня з прызначэння сакратарыята, загад аб якім аддадзены 11 ліпеня 1921 г. Старшынёй з'яўляўся наркам асветы У. Ігнатоўскі, намеснікам – С. М. Некрашэвіч, вучоным сакрата-

УМЦ БДПУ

ром – У. В. Чаржынскі, усяго – 11 чалавек [14, с. 54]. Сярод асноўных задач, пастаўленых перад АЦ, былі і такія: непасрэднае кіраўніцтва ўстановамі, якія ставяць перад сабой чыста навуковую і мастацкую акадэмічную работу (Акадэміі, НДУ, вучоныя таварыствы і г. д.), запрашэнне ў Беларусь і падрыхтоўка ўласных навуковых сіл [15, арк. 4, с. 54].

Такія арганізацыйныя захады не былі ўнікальнымі і мелі месца не толькі на беларускай глебе. Так, у 1921 г. створаны Акадэмцэнтр НКА Татарстана, які выпускаў навуковыя часопісы, манаграфіі, падручнікі. Падобнае прадпрымалася ў Дагестане – арганізацыя ў жніўні 1921 г. Акадэмцэнтра Наркамасветы. У Башкірскай АССР з 1922 г. пры АЦ дзейнічала «Таварыства па вывучэнні Башкірыі», а пазней былі арганізаваны Башкірскі комплексны навукова-даследчы інстытут і Інстытут нацыянальнай культуры [16].

На працягу 1921 г. у структуры АЦ НКА БССР існавала 17 устаноў: побач з НТК, навукова-гістарычным яўрэйскім таварыствам пад адзінаццатым нумарам у справаздачы пазначаны Інстытут беларускай культуры [17, арк. 40, с. 54]. Гэтаксама і «Звесткі аб дзейнасці ўстаноў НКА на 01.09.21 г.» на пытанне аб наяўнасці навуковых устаноў адказваюць: «1. Інстытут беларускай культуры (арганізуецца) ... 5. Беларуская тэрміналагічная камісія (выпрацоўвае навуковыя тэрміны на беларускай мове)» [18, арк. 4 адв.].

Раней, у лютым 1921 г., пры абмеркаванні пытання аб універсітэце на II сесіі ЦВК БССР НКА інфармаваў: «Ідучы насустрач развіццю культур мясцовых моў, мы пры БДУ адчыняем два інстытуты – беларускай і яўрэйскай культуры» (ІБіЯК). У красавіку 1921 г. III сесія ЦВК БССР пастанавіла: «...устанавіць пры ўніверсітэце Навукова-даследчы інстытут беларускай і яўрэйскай культуры» [19, с. 16, 43]. Тое самае ўтрымліваў ліпеньскі дэкрэт ураду аб адкрыцці БДУ. Аднак універсітэт пачаў сваю дзейнасць без ІБіЯК. Інбелкульт жа, як паказана вышэй, фіксуецца ў якасці асобнай арганізацыі ў складзе Акадэмцэнтра наркамата асветы з пачатку верасня 1921 г.

За 1921 г. ІБК «зрабіў падрыхтоўчую работу да арганізацыі ўсіх беларускіх навуковых устаноў у адзін навукова-даследчы Інстытут беларускай культуры, які павінны адкрыць сваю дзейнасць у…1922 г.» [20, арк 40, с. 55]. Дарэчы, 4 лістапада 1924 г. А. В. Баліцкі на пасяджэнні ЦВК гаварыў літаральна наступнае: «*Тры гады існавання* Інстытуту паказалі яго важнае значэнне ў культурным будаўніцтве Беларусі» [21, с. 96]. Такім чынам, намеснік наркама асветы адлічваў фактычнае існаванне Інстытута ад восені 1921 г.

У гістарыяграфіі пануе думка пра тое, што *першы статут* Інстытута пакуль не выяўлены. Статут ІБК і статуты іншых устаноў Акадэмцэнтра, напрыклад НТК, іх тады часцей называлі «палажэнні», зацвярджаліся НКА, але кепская захаванасць матэрыялаў пачатку 1920-х гг. дагэтуль не дазволіла даследчыкам знайсці арыгінальны тэкст. Тым не менш лістападаўскае (1921 г.) паведамленне «Вестника Наркомпроса ССРБ» дае магчымасць скампанаваць інфармацыю, якая ўтрымлівае асноўныя палажэнні статута.

**Статут Інстытута беларускай культуры**

**1. Агульныя палажэнні.** Асноўная задача Інстытута беларускай культуры – даследаванне Беларусі ў этнаграфічным, лінгвістычным, літаратурным, мастацкім, культурна-гістарычным, прыродазнаўчым і геаграфічным плане.

**2. Агульны сход і Вучоная рада** – у іх кампетэнцыю ўваходзіць разгляд пытанняў агульнакультурнага зместу, выдавецтва, школ, навуковыя, кадравыя і іншыя пытанні.

**3. Секцыі:** этнолага-лінгвістычная, літаратурна-мастацкая, культурна-гістарычная, грамадска-эканамічных навук, прыродазнаўчых навук, геаграфіі, танічных і пластычных мастацтваў. Кожная секцыя з'яўляецца аўтаномнай адзінкай і самастойна вядзе працу па ўсіх пытаннях, якія яе тычацца. Секцыі падзяляюцца на камісіі. Інбелкульт мае права арганізоўваць экспедыцыі, склікаць з'езды, адчыняць музеі, архівы, бібліятэкі, новыя секцыі і ўвогуле пашыраць сферу сваёй дзейнасці, накіроўваючы яе і ў іншыя галіны навукі, датычных беларусазнаўства.

**4. Асабовы склад.** Фарміруецца з правадзейных членаў, навуковых супрацоўнікаў і членаў-карэспандэнтаў; яны абіраюцца Вучонай радай інстытута. Правадзейныя члены – аўтарытэтныя навуковыя сілы, вядуць самастойныя навуковыя даследаванні, загадваюць асобнымі кафедрамі і навуковадапаможнымі ўстановамі, кіруюць навуковымі заняткамі навуковых супрацоўнікаў. Навуковыя супрацоўнікі – асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю і праявілі схільнасць да даследчыцкай работы, а таксама ўсе іншыя асобы, якія зарэкамендавалі сябе падрыхтаванымі да самастойных даследчыцкіх работ; дапамагаюць правадзейным членам у іх ра-

боце як асістэнты, лабаранты, кіраўнікі практычных заняткаў. Выбіраюцца Вучонай Радай Інбелкульта з асоб, якія маюць закончаную вышэйшую адукацыю, выявілі схільнасць да даследчай працы ў галіне беларусазнаўства, а таксама з усіх іншых асоб, якія паказалі сябе дастаткова падрыхтаванымі да ажыццяўлення самастойных даследчыцкіх работ. Члены-карэспандэнты – асобы, якія сваімі працамі, паведамленнямі, пэўнымі мерапрыемствамі спрыяюць дасягненню інстытутам яго навуковых мэтаў. Правадзейныя члены і навуковыя супрацоўнікі працуюць у Інстытуце на штатных пасадах.

**5. Падрыхтоўка кадраў.** Інстытут падрыхтоўвае практычных дзеячаў для абследавання і вывучэння беларускай культуры. Навуковыя супрацоўнікі падрыхтоўваюцца да самастойнай даследчыцкай дзейнасці ў галіне беларусазнаўства. Тэрмін знаходжання ў інстытуце для асоб, што рыхтуюцца да даследчыцкай работы, – два гады, ён можа быць падоўжаны для асобных супрацоўнікаў.

Такім чынам, Інбелкульт мусіў мець у сваім складзе 6 секцый. У НКА лічылі, што НТК *складзе толькі ядро і толькі адной* секцыі – этнолага-лінгвістычнай [22, с. 32–34]. Аднак першапачаткова ствараюцца ўсяго дзве – этнолага-лінгвістычная і прыродазнаўчая. Выходзіць, меў рацыю У. М. Ігнатоўскі, калі ў 1928 г. пісаў: «…Інбелкульт у пачатку 1922 г. упітвае ў сябе Тэрміналагічную камісію, каторая перастае існаваць самастойна» [23, с 11].

Няма ў навуковай літаратуры і кансалідаванага меркавання аб *колькасці членаў ІБК* на працягу першых гадоў яго існавання. Як правіла, гаворыцца аб 15 супрацоўніках на пачатку яго дзейнасці. Аднак, паводле розных каштарысаў установы на 1922 г., складзеных у 1921 г., колькасць яго супрацоўнікаў меркавалася ў памеры і 27 чалавек, і 35-ці, і 38-мі [24, арк. 41 адг. арк. 45, арк. 6]. 26 верасня 1921 г. былі зацверджаны штаты АЦ. Паводле іх Інстытут беларускай і яўрэйскай культуры павінны быў мець аднаго старшыню, аднаго сакратара і двух членаў па сумяшчэнні, а НТК – 20 (па адным – старшыня, сакратар і 18 членаў) [25, арк. 2]. Рэальнасць унесла свае карэктывы ў планаваныя паказчыкі. Пакажам рэальную кадравую дынаміку храналагічна, пачынаючы са студзеня 1922 г.:

- 24 студзеня ЦВК ССРБ пастанавіў «пакінуць на ўтрыманні» ў ІБК 15 супрацоўнікаў [26, арк. 1 адг];
- 31 студзеня штаты Акадэмцэнтра, адпраўленыя ў Арганізацыйны цэнтр НКА, утрымліваюць інфармацыю пра 17 членаў (16 навуковых) інстытута (1 дырэктар, 1 сакратар, 6 правадзейных членаў, 8 навуковых супрацоўнікаў, 1 кур'ер) [27, арк. 12]. Гэтая пазіцыя амаль цалкам пацвярджаецца публікацыяй, якая дазваляе паіменна назваць першых супрацоўнікаў: старшыня – С. М. Некрашэвіч, сакратар – У. В. Чаржынскі; правадзейныя члены – Я. Ф. Карскі, Я. Ю. Лёсік, І. Д. Луцэвіч, К. М. Міцкевіч; навуковыя супрацоўнікі – М. В. Азбукін, М. Я. Байкоў, Л. Л. Більдзюкевіч, Ф. Ф. Бурак, М. А. Грамыка, М. М. Гуткоўскі, А. П. Круталевіч, В. Ф. Міхальскі, М. М. Пятуховіч, С. Я. Плаўнік, Ч. І. Родзевіч, усяго 17 чалавек [28, с.15]. Такім чынам, у першы склад ІБК увайшла большасць членаў НТК;
- у маі 1923 г. пры падрыхтоўцы даных пра «нацыянальны склад культурных устаноў Беларусі» ўсё яшчэ фіксуецца наяўнасць 17 супрацоўнікаў – 16 беларусаў і адзін яўрэй [29, арк. 50, арк. 3];
- на 1 кастрычніка Інбелкульт налічваў у сваім складзе 12 супрацоўнікаў [30];
- у снежні штаты ІБК, вызначаныя загадам НКА, таксама акрэсліваліся ў 12 чалавек, у т. л. 1 старшыня, 1 сакратар, 9 членаў, 1 справавод [31, арк. 104];
- тое самае пацвярджалася планамі на 1923/1924 бюджэтны год.

Пасля актывізацыі працы Інбелкульта адбываецца пэўны рост яго работнікаў:

- на пачатку сакавіка 1924 г. іх фіксуецца 25 [32, арк. 73];
- у маі 1926 г. – 71, у тым ліку 19 чалавек тэхперсаналу (без выдзялення навукова-тэхнічнага з астатніх 52-х) [33, арк. 4 адг.- 5];
- 30 верасня 1927 г. Інстытут налічваў 94 штатных супрацоўнікаў, у т. л. 32 навуковых работнікаў [34, арк. 67].

Пры гэтым у навуцы тыражуюцца даныя пра 176 членаў ІБК на 15 ліпеня 1927 г. Можна згадаць і іншыя лічбы. Часта выкарыстоўваецца інфармацыя пра тое, што «на 1 кастрычніка 1926 г. Інбелкульт налічваў у сваім складзе 224 члена… Акрамя таго, у якасці членаў секцый… працуе каля 200 навуковых працаўнікоў, *пераважна* з вышэйшых школ Беларусі» [35, с. 432]. Папулярныя яны і ў сучасных навукоўцаў. У. І. Навіцкі ўвогуле «ўдакладніў» аўтараў 1920-х гг. У яго слова «пераважна» знікла, а адпаведны тэкст пададзены наступным чынам: «…каля 200 *навуковых супрацоўні-*

УМЦ БДПУ

*каў з ліку прафесараў і выкладчыкаў* ВНУ рэспублікі» [36, с. 236]. У дыдактычным выданні А. М. Вабішчэвіча пакінута толькі адна лічба і адна дата – 224 чалавекі на 1 кастрычніка 1926 г. і праігнаравана канстатацыя пра 200 навуковых работнікаў, прыцягнутых да працы пераважна з вышэйшых школ Беларусі [37, с. 103]. Пэўным чынам зразумець папулярнасць завышаных лічбаў, што прысутнічаюць у некаторых дакументах, дапамагаюць словы з прамовы А. А. Смоліча на II навуковай канферэнцыі (з'ездзе) у кастрычніку 1925 г.: «ІБК не Акадэмія, а шырокая грамадская ўстанова, якая яднае ў сваёй працы шмат даследчыкаў па розных кутках Беларусі» [38, арк. 68 адг]. Дапамагае зразумець жаданне прадставіць у другой палове 1920-х гг. больш «важкую» кадравую карціну і той факт, што менавіта з 1926 г. актыўна здзяйсняюцца канкрэтныя практычныя захады па пераўтварэнні ІБК у Акадэмію навук.

Каб скласці ўяўленне пра адэкватнасць прыведзеных даных, якія і сёння выкарыстоўваюцца некрытычна, трэба звярнуцца да агульнай колькаснай дынамікі навукоўцаў у рэспубліцы. Паводле Секцыі навуковых работнікаў, у Беларусі налічвалася (зарэгістраваных) 186 членаў СНР на 1 мая 1924 г., 202 – на 1 студзеня 1925 г., 359 – на 1 снежня 1926 г., 384 – на 1 лютага 1927 г., 403 – на 1 мая 1927 г. З апошніх 103 не мелі «друкаваных прац». Прыведзенае патрабуе верыфікацыі, паколькі ў 1920-я гг. адбываецца працэс выпрацоўкі самога паняцця «навуковыя работнікі». Напрыклад, у 1926 г. у Белдзяржмузеі да навукоўцаў залічаны «дзелавод і чучальнік», у 1927 г. у БСГА – навуковатэхнічны персанал [39, арк. 13, 99, 188; арк. 2; арк; 1,6; арк; арк.124].

Што тычыцца дзейнасці ІБК, то тут, у першую чаргу, прыцягвае ўвагу традыцыйная манера яе асвятлення з 1922 г., калі яна характарызуецца выключна станоўча, як няўхільнае развіццё навуковых даследаванняў і павелічэнне штатнага складу навукоўцаў. Фактычна такі падыход стаў стэрэатыпам. Але ён не зусім адпавядае тагачаснай рэчаіснасці. Гэта становіцца відавочным, калі звярнуць увагу на тое, што было зроблена, у прыватнасці, за першыя тры-чатыры гады.

Напрыклад, у 1922 г. праца выявілася ў наступным:

- *1–7 лютага* – 4 агульныя сходы, на якіх абраны навуковыя супрацоўнікі, акрэслены план дзейнасці; створаны секцыі і камісія па арганізацыі ўрачыстага пасяджэння з нагоды адкрыцця ІБК, якое павінна было адбыцца 20 лютага;
- *сакавік* – 2 агульных і 15 секцыйных пасяджэнняў, разглядалася, галоўным чынам, беларуская навуковая тэрміналогія, прынята каля 600 тэрмінаў;
- *красавік* – за выключэннем звычайнай навуковай працы (тэрміналагічнай), пачалася падрыхтоўка матэрыялаў для навукова-літаратурнага часопіса «Веда», рэдакцыя даручана Я. Ю. Лёсіку;
- *май* – 2 агульныя пасяджэнні і 20 пасяджэнняў камісій, на якіх разгледжаны і прыняты 660 тэрмінаў;
- *чэрвень* – 18 пасяджэнняў, апрацавана 490 тэрмінаў, вялася праца па выданні часопіса «Адраджэнне»;
- *ліпень* – частка супрацоўнікаў знаходзілася ў адпачынку, астатнія выязджалі ў паветы ў якасці лектараў на розныя курсы;
- *верасень* – 14 пасяджэнняў, апрацавана 600 тэрмінаў, слоўнікавая камісія прыняла 2000 слоў [40, арк. 27, 31, 58, 87, 103, 110, 134, 143].

За тры гады, 1922–1924, выдадзена 6 выпускаў беларускай тэрміналогіі, прыняты 15 000 слоў-тэрмінаў, арганізаваны археалагічная і этнаграфічная экспедыцыі ў 1923 г. [41, арк. 71–72]. Праведзены дзве краязнаўчыя канферэнцыі і глебазнаўчы з'езд. Слядоў яшчэ якой-небудзь навуковадаследчай дзейнасці пакуль не ўстаноўлена. Па сутнасці, працягвалася папярэдняя тэрміналагічная праца, нягледзячы на значна шырэйшыя навуковыя функцыі, прадугледжаныя першым статутам. Сціпласць інтэлектуальных сіл не дазволіла, такім чынам, разгарнуць меркаваную працу. Яе адсутнасць паказвае, што ІБК фактычна не функцыянаваў як установа новага тыпу, паколькі не быў структураваны і не ажыццяўляў, у адпаведнасці з палажэннямі статута, шырокай комплекснай навукова-даследчай дзейнасці.

Такое становішча абумовіла чарговую хвалю ўвагі да Інстытута, з сярэдзіны 1923 − пачатку 1924 г. Аб гэтым можна меркаваць па выяўленых праектах двух статутаў навукова-даследчага інстытута. Адзін, магчыма, належыць пяру У. І. Пічэты і мае назву «Праект статута Навукова-Даследчага Інстытута па вывучэнню Беларусі пры Беларускім Дзяржаўным Універсітэце». Два варыянты другога − «Статут Інстытуту Беларускае культуры»

[42, арк. 117–118; арк. 33–34; арк 96–96 адг]. Звернем увагу, што ўсе варыянты разглядаюць будучы НДІ *як вышэйшую навуковую ўстанову*. Толькі ў «непічэтаўскіх» праектах статута ІБК ёсць важны дадатак − слова «*дзяржаўная*». Зразумела, амбіцыі ініцыятараў і архітэктараў навуковага будаўніцтва ў БССР сягалі далей прапановы зноў вярнуцца да ідэі НДІ пры БДУ, не рэалізаванай на першым годзе існавання ўніверсітэта. Іх мэту можна коратка сфармуляваць наступным чынам: ІБК − прыступка на шляху стварэння Акадэміі навук.

Развіццё эканомікі ва ўмовах нэпа, рэалізацыя нацыянальнай палітыкі (беларусізацыя і карэнізацыя) у значнай ступені пачынаюць уплываць на навукова-арганізацыйную сітуацыю. Такое супадзенне палітыка-ідэалагічнага і эканамічнага фактараў дазволіла пачаць з вясны 1924 г. кампанію па рэарганізацыі ІБК. 26 красавіка 1924 г. агульны сход ІБК, на якім прысутнічалі 14 чалавек, зацвердзіў структуру ўстановы ў наступным выглядзе: секцыі этнаграфіі і геаграфіі (арганізацыя даручана М. В. Азбукіну), літаратурна-мастацкая (Я. Л. Дыла), юрыдычная (М. М. Гуткоўскі), гісторыка-археалагічная (В. Д. Друшчыц), педагагічная (Я. Ф. Сушынскі), медыка-ветэрынарная (І. І. Цвікевіч), сацыяльна-эканамічная (А. К. Успенскі і З. Х. Жылуновіч); тэрміналагічныя (Прэзідыум) і біяграфічная (Я. Л. Дыла) камісіі. Быў абраны новы Прэзідыум у пашыраным складзе: С. М. Некрашэвіч (старшыня), І. І. Цвікевіч (намеснік старшыні), Я. Л. Дыла (член Прэзідыуму) і М. А. Грамыка (сакратар) [43, арк. 6; с. 58, 59].

Наступным крокам у развіцці ІБК стала «Палажэнне», абмеркаванае на пасяджэнні ЦВК і юрыдычна афармленае пастановай ЦВК і СНК БССР 25 ліпеня 1924 г. Тут не толькі нармаваліся арганізацыйныя пытанні функцыянавання Інстытута, але і ўпершыню афіцыйна абвяшчалася, што ІБК з’яўляецца «вышэйшай дзяржаўнай навуковай установай у Беларусі, уваходзячай у склад Наркамасветы БССР» [44, арт. 161].

У канцы 1924 г. актывізуецца адмысловая камісія ЦК КП(б)Б па рэарганізацыі ІБК. На яе пасяджэннях даволі канкрэтна і падрабязна разглядаліся будучая структура і асноўныя кірункі дзейнасці ІБК. Напрыклад, было вырашана скасаваць археаграфічную камісію, усклаўшы яе абавязкі на гісторыка-археалагічную; пастаноўлена камісіі разумець як даследчыя кафедры, а секцыі як навуковыя таварыствы і г. д. Камісія ЦК зацвердзіла структуру і штаты ўстановы [45, с. 14]. Асаблівую цікавасць уяўляе яе пасяджэнне 12 снежня 1924 г., калі ў парадку дня стаяла пытанне «Аб *адчыненні* Інбелкультa», а ў пятым пункце рашэння камісіі запісана: «Прызнаць пажаданым урачыстае адчыненне Інбелкульту з запрашэннем на яго прадстаўнікоў навукі» [46, арк. 64-65]. Думаецца, у пастанове камісіі ЦК няма двайной апіскі. Такое рашэнне становіцца зразумелым, калі памятаць аб зробленым ІБК за 1922–1924 гг. Па сутнасці, пад старой назвай – Інстытут беларускай культуры – ствaралася новая комплексная навуковая ўстанова.

Аб значэнні новага ІБК сведчыць яго кіроўны склад. Сакратарыят ЦК КП(б)Б 30 снежня 1924 г. вызначыў склад прэзідыуму інстытута ў колькасці шасці чалавек: У. М. Ігнатоўскі, З. Х. Жылуновіч, А. А. Смоліч, С. Л. Гельтман, Я. Л. Дыла, Я. К. Апанскі. Персанальнае вызначэнне старшыні, намесніка і сакратара аднесена да кампетэнцыі камфракцыі ІБК [47, арк. 457]. Якое рашэнне яна прыняла, вынікае з пастановы агульнага сходу Інбелкульта 31 студзеня 1925 г., калі па прапанове А. В. Баліцкага сход абраў старшынёй Інстытуту і прэзідыуму У. М. Ігнатоўскага, намеснікам – А. А. Смоліча, членамі Прэзідыуму – З. Х. Жылуновіча, Б. М. Аршанскага, С. Л. Гельтмана, Я. Л. Дылу [48, арк. 1]. Важнасць канстытуявання Інбелкульта ў гэты час падкрэсліваецца тым, што яго ўзначаліў наркам асветы. Перад тым, 16 студзеня, НКА зацвердзіў асабовы склад і структуру Інбелкульта [49, с. 2–4].

Такім чынам, можна гаварыць аб другім нараджэнні Інстытута беларускай культуры ў 1925 г. Дарэчы, В. К. Шчарбакоў пісаў пра існаванне ІБК з 1923 па 1929 г. [50, с. 82]. А замежны даследнік яўрэйскай навуковай дзейнасці ў СССР А. Грынбаум яшчэ ў 1970-х гг. выказаў слушную думку: «Ужо ў ліпені 1924 г. *нанова* засноўваючы Інстытут беларускай культуры...» [51, с. 33]. Як уяўляецца, і першыя захады па развіцці навуковай дзейнасці ў БССР, і другое стварэнне ІБК мелі стратэгічную мэту – адкрыццё нацыянальнай Акадэміі навук. Расійскі аўтар Ф. Ф. Перчанок адзначаў: «Яшчэ ў 1924 г. кіраўнікі ІБК паставілі перад урадам Беларусі пытанне аб пераўтварэнні ІБК у БелАН» [52, с. 165–225]. Пазней тое самае напісаў акадэмік Р. Г. Гарэцкі [53]. Падаецца, менавіта абмежаванасць інтэлектуальных рэсурсаў не дазволіла ў сярэдзіне

УМЦ БГПУ

1920-х гг. непасрэдна прыступіць да будавання Акадэміі навук.

Становішча ІБК як адной са шматлікіх устаноў Наркамата асветы ў свой час, магчыма, аблягчала правядзенне ўнутрыінстытуцкіх рэканструкцыйных мерапрыемстваў, не патрабуючы абавязковага ўзгаднення з маскоўскімі цэнтральнымі ўстановамі. Але ж гэтае становішча, па ўсёй бачнасці, звужала поле дзейнасці пры наяўным імкненні да далейшых арганізацыйных зменаў. Менавіта таму ў лютым 1926 г. урад Беларусі павышае статус Інбелкульта, выводзячы яго з падпарадкавання НКА і робячы самастойнай установай пры СНК БССР. Адначасова старшынёй прэзідыуму Інстытута зноў быў зацверджаны У. М. Ігнатоўскі, які той жа пастановай вызваляўся па ўласным жаданні ад абавязкаў наркама асветы [54, арт. 189].

Імкненне арганізаваць БАН, тым не менш, не знікла. Працягам стала юрыдычнае афармленне працэсу, што выявілася ў прыняцці прынцыпова новага статуту Інбелкульта, створанага па аналогіі з адпаведнымі дакументамі Акадэмій навук СССР і Украіны. Зразумела, у акадэмічным статуце ІБК, зацверджаным СНК БССР 29 чэрвеня 1927 г., вызначаліся прынцыпы структурнай будовы ўстановы, кадравай складовай і прадугледжвалася значнае пашырэнне абсягу навукова-даследчай дзейнасці. Цяпер інстытут быў падзелены на два аддзелы: прыроды і гаспадаркі і гуманітарных навук, нацыянальныя аддзелы сталі называцца сектарамі, больш дакладна фармуляваліся кваліфікацыйныя патрабаванні да супрацоўнікаў, далейшае юрыдычнае афармленне атрымала сістэма падрыхтоўкі маладых навукоўцаў – аспірантура [55, арт. 158].

Перыядычныя арганізацыйныя змены мелі на мэце пашырэнне і аптымізацыю навукова-даследчай працы ў рэспубліцы. Як сведчаць даследаванні і дакументальныя матэрыялы, менавіта з другой паловы 1920-х гг. Інбелкульт пачынае ўсё больш упэўнена заяўляць пра сябе як беларускім цэнтры навуковай думкі. Няўдалая спроба стварэння Акадэміі навук у 1927 г. мела і станоўчы бок – наданне Інбелкульту акадэмічнага статуту і, фактычна, новага статусу. З сакавіка 1928 г. думку аб своечасовасці рэарганізацыі ІБК у Акадэмію навук адзначаў У. М. Ігнатоўскі: «Будзе спатыкацца цяпер часта, як на Беларусі, так і ў СССР». І далей: «Пастулова яна ўсё больш і больш будзе пашырацца і захапліваць як партыйную, так і беспартыйную грамадскасць» [56, с. 24].

Змена статусу ІБК абумовіла павышэнне ўзроўню органаў улады, якія сталі вырашаць яго лёс. Так, ЦВК СССР 1 чэрвеня 1926 г. у рэзалюцыі па дакладзе беларускага ўраду адзначыў, што ІБК павінны стаць БАН [57, арк. 332]. Тое самае канстатавала ліпеньская пастанова СНК БССР: «...лічыць неабходным з 1926–1927 акадэмічнага году надаць ІБК напрамак да паступовага пераўтварэння яго ў Беларускую Акадэмію Навук» [58, арт. 106]. Без канчатковага ўхвалення партыйнымі органамі падобныя мерапрыемствы не маглі быць ажыццёўлены. Аб узгадненні пытання паміж ЦК УсеКП(б) і рэспубліканскай партарганізацыяй сведчыць снежаньская (1926 г.) пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб неабходнасці зімяншэння культурна-грамадскай работы ІБК і надання ёй больш акадэмічнага кірунку. Цалкам раскрывае партыйна-дзяржаўныя планы пасяджэнне бюро ЦК кампартыі Беларусі ў студзені 1927 г., на якім фактычна паўтораны асноўныя палажэнні ліпеньскай (1926 г.) пастановы СНК аб пераўтварэнні ІБК у БАН. У. М. Ігнатоўскі, пішучы пра пасяджэнне, якое мела месца 15 студзеня, звяртае ўвагу на адно з яго рашэнняў, а менавіта аб несвоечасовасці ў «дадзены момант» рэарганізацыі Інбелкульта ў Акадэмію навук [59, с. 21]. У 1999 г. М. У. Токараў, дэталізуючы канстатацыю папярэдняй публікацыі [60, с. 18], адзначаў: «Пра тэрміны пераўтварэння Інбелкульта ў акадэмію існавалі дзве думкі. Адна адлюстроўвала пункт погляду вышэйшых органаў кіравання рэспублікі, а менавіта: не спяшацца, а паступова падводзіць інстытут да рэарганізацыі ў акадэмію; другая – і гэта было жаданне кіраўніцтва ІБК – не адкладаючы, ужо ў канцы 1926 г. абвясціць пра стварэнне Беларускай Акадэміі навук» [61, с. 8; с. 36]. Тое ж даследчык сцвярджаў і пазней [62, с. 30]. Аднак у матэрыялах сакрэтнага аддзелу ЦК утрымліваецца інфармацыя аб тым, што бюро ЦК палічыла неабходным «здзейсніць гэта перайменаванне ў сувязі са святкаваннем 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. З аднаго боку, гэты факт будзе гаварыць аб адным з нашых дасягненняў, з іншага боку ён звязвае БАН з імем Кастрычніка. БАН будзе першай, пакуль адзінай акадэміяй, якая створана рукамі Камуністычнай партыі і Савецкай улады, акадэміяй, якая не мае традыцыі дакастрычніцкага часу» [63, арк. 333].

Чарговая спроба стварэння Акадэміі навук аказалася, тым не менш, беспаспяховай.

І гэта зразумела, паколькі праблема заключалася ў навукова-кадравым патэнцыяле, у яго недастатковасці. Так, у 1925 г. адпаведна «Раскладу сапраўдных членаў ІБК па секцыям» з агульнай колькасці прыведзеных 57 прозвішчаў супрацоўнікаў 18 былі задзейнічаны у адной секцыі, 35 – у двух і 4 – у трох [64, арк. 4]. Звяртаючы ўвагу на персаналіі, намінальнасць удзелу ў працы ІБК многіх асобаў відавочная: Я. А. Адамовіч (старшыня СНК БССР), А. Р. Чарвякоў (старшыня ЦВК БССР і сустаршыня ЦВК СССР), А. Крыніцкі (сакратар ЦК КП(б)Б), З. Х. Жылуновіч (кіраўнік Галоўархіву), А. В. Баліцкі (нам. наркама асветы), Я. П. Каранеўскі (заг. Галоўсацвыхавання НКА), А. К. Успенскі (заг. Галоўпрафадукацыі НКА), М. І. Мароз (заг. Белдзяржвыдавецтва), П. А. Растаргуеў (вядомы расійскі мовазнаўца, у Беларусі не жыў і не працаваў), А. К. Сержпутоўскі (супрацоўнік этнаграфічнага аддзелу Рускага музея ў Ленінградзе, бываў у Беларусі наездамі, за 20 міжваенных гадоў наведаўся з навуковымі мэтамі 20 разоў [65, с. 13] і інш.

Адначасова пачынаюць рабіцца значныя фінансавыя ўкладанні ў Інстытут. У 1923/24 акадэмічным годзе на Інбелкульт было выдаткавана ўсяго 7186 руб. [66, с. 14], а толькі за тры бюджэтныя гады, з 1924/25 па 1926/27, фінансаванне ІБК узрасло з 77 906 да 329 530 рублёў [67, с. 433, арк. 75] у маштабах 1927 г. павялічылася амаль на 323 %. Можна сустрэць інфармацыю аб росце бюджэту інстытута ў наступным годзе на 22,4 % пры суме ў 359 тыс. руб. [68, с. 26].

Выказаная думка аб немагчымасці стварыць Акадэмію з прычыны адсутнасці неабходнага кадравага патэнцыялу пацвярджаецца шэрагам фактаў. У прыватнасці, у канцы 1926 г. сацыяльна-эканамічная секцыя налічвала ў сваім складзе 34 асобы, сярод якіх былі прадстаўнікі ад ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК БССР, Наркаматаў земляробства, унутранага гандлю, фінансаў, рабоча-сялянскай інспекцыі, ЦСУ, Дзяржплану і яшчэ васьмі арганізацый, у той час як у секцыі планаваўся на гэты год усяго адзін штатны супрацоўнік [69, арк. 79. адг.- 80, 88]. Такім чынам, і ў канцы 1926 і, напэўна, у 1927 г. ІБК усё яшчэ не пазбавіўся сваіх грамадскіх функцый. Нягледзячы на шэраг партыйна-ўрадавых рашэнняў аб наданні інстытуту выключна навуковага характару, ён уяўляў своеасаблівы навукова-грамадскі цэнтр, у якім распрацоўваліся мерапрыемствы, што тычыліся розных бакоў жыцця рэспублікі, і прымаліся адпаведныя рашэнні, амаль да кадравых прызначэнняў, прынамсі ў дачыненні да навукі і вышэйшай адукацыі, аб чым гутарка пойдзе ніжэй. Магчыма, усё гэта мелася на ўвазе, калі палітбюро ЦК УКП(б) 27 кастрычніка 1927 г. пастанавіла адкласці рэарганізацыю Інбелкульта ў БАН [70, с. 32].

Праца па стварэнні Акадэміі навук, тым не менш, не спынілася. Працягам яе стала юрыдычнае афармленне працэсу, што выявілася ў прыняцці прынцыпова новага статуту Інбелкульта, створанага па аналогіі з адпаведнымі дакументамі Акадэмій навук СССР і Украіны. Зразумела, у акадэмічным статуце ІБК, зацверджаным СНК БССР 29 чэрвеня 1927 г. [71, арт. 158], вызначаліся прынцыпы арганізацыйнай будовы ўстановы, кадравай складовай і прадугледжвалася значнае пашырэнне абсягу навукова-даследчай дзейнасці. Цяпер інстытут быў падзелены на два аддзелы: прыроды і гаспадаркі і гуманітарных навук, нацыянальныя аддзелы сталі называцца сектарамі, больш дакладна фармуляваліся кваліфікацыйныя патрабаванні да супрацоўнікаў, далейшае юрыдычнае афармленне атрымала сістэма падрыхтоўкі маладых навукоўцаў – аспірантура.

Як і ва Украінскай Акадэміі навук, у ІБК галоўная ўвага надавалася даследаванню комплексу гуманітарных дысцыплін, якое канцэнтравалася ў аддзеле гуманітарных навук. За выключэннем матэрыяльнага і кадравага фактараў, такое падабенства абумоўлівалася і агульнасцю гістарычных лёсаў дзвюх рэспублік, што ставіла на парадак дня агульныя задачы: самапазнанне і самасцвярджэнне народаў як суб'ектаў гістарычнага працэсу, чаму, падавалася, будзе ўсімі спосабамі спрыяць савецкая ўлада. Як адзначаў Ф. Ф. Перчанок датычна УАН, хаця яго думку можна цалкам дастасаваць да ІБК і БАН: «Пастаноўка ў цэнтр увагі комплексу навук, звязаных са сваім народам, і арганізацыя вакол яго ўсіх гуманітарных навук – нічога падобнага не было ў практыцы акадэмій навук усяго свету» [72, с. 201–235].

Чарговы этап навукова-арганізацыйнага будаўніцтва супаў з новымі тэндэнцыямі ў палітычным і эканамічным жыцці СССР. Развіццё культурнай рэвалюцыі, непасрэдна звязанае з сацыялістычнай індустрыялізацыяй і суцэльнай калектывізацыяй, не магло не адбіцца на статусе акадэмічнай установы. Для яго разумення можна вылучыць тры моманты, якія прысутнічаюць і ў наступных

УМ БГПУ

акадэмічных статутах, паколькі, нягледзячы на пазнейшыя змены і карэкціроўкі апошніх, гэтыя тры чыннікі заставаліся нязменнымі і вызначалі асаблівасці акадэмічнага жыцця на дзесяцігоддзі. Па-першае, ІБК знаходзіўся ў падпарадкаванні СНК, а таму кіраўніцтва і супрацоўнікі інстытута зацвярджалася (кандыдатуры першых вызначаліся), нягледзячы на прадугледжаныя выбары, менавіта ім па ўзгадненні з ЦК кампартыі. Ясна, што ў дадзеным выпадку для акадэмічнай свабоды, навуковай незалежнасці месца фактычна не заставалася. Па-другое, яшчэ адной навіной акадэмічнага статута, запазычанай са статута АН СССР, стала магчымасць вызвалення ад абавязкаў членаў ІБК тых асоб, «дзейнасць якіх відавочна накіравана на шкоду БССР або іншых саюзных рэспублік». Трэці момант – абавязковае ўвядзенне планавасці даследаванняў. Паколькі ІБК структурна ўваходзіў у склад СНК і фінансаваўся выключна дзяржавай, то ён павінны быў існаваць у рэчышчы агульнага народнагаспадарчага планавання, якое абумоўлівала неабходнасць планавання навуковага, прычым адпаведна характару савецкай улады татальнага.

План становіцца сродкам усеахопнага кіравання і кантролю, таму навуку прымушалі планаваць сваю працу, вылічаць усе будучыя работы. Задача планавання дзейнасці была канкрэтна пастаўлена перад АН СССР у 1928 г. Годам раней на XV з'ездзе УсеКП(б) М. М. Пакроўскі ва ўзаемаўвязцы з народнагаспадарчым планам на пяцігодку патрабаваў такога самага плану і ад Акадэміі [73, с. 211, 214]. АН СССР пачала планаванне навуковай працы ў 1930 г., склаўшы першы ў яе гісторыі план даследаванняў на 1931 г. і на другую пяцігодку [74, ст. 297]. З канца 1920-х гг. прынцып планавання становіцца асноўным у арганізацыі навукі. У кастрычніку 1931 г. адбылася першая Усесаюзная канферэнцыя па планаванні навукова-даследчай работы, якое стала ахопліваць усе навуковыя ўстановы [75, с. 578]. Практычнае ўвасабленне ідэй укаранення плана ў навуцы было апрабіравана, магчыма, ў Беларусі. Ужо ў канцы 1927 г. па прапанове Дзяржплана Інбелкульт упершыню падрыхтаваў план навукова-даследчай працы на 1928/29–1932/33 гг. [76, с. 22].

Паводле новага статуту, асноўная праца ў галіне гуманітарных даследаванняў гуртавалася ў нацыянальных навуковых падраздзяленнях, камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі, у пэўнай ступені ў Цэнтральным бюро краязнаўства і аддзеле гуманітарных навук. Апошні падзяляўся на два класы – гісторыі і філалогіі, структура якіх, у сваю чаргу, складалася з кафедраў і камісій. Старшынёй аддзелу стаў С. М. Некрашэвіч, сакратаром – Я. К. Бялькевіч. Агульнае кіраўніцтва дзейнасцю ўстаноў ажыццяўляла Рада ў складзе 19 чалавек (С. М. Некрашэвіч, У. М. Ігнатоўскі, А. І. Цвікевіч, А. М. Ясінскі, В. Д. Друшчыц, Я. Ю. Лёсік, М. М. Дурнаво, У. І. Пічэта, І. І. Замоцін, В. Ю. Ластоўскі і інш.) [77, с. 66; арк. 18].

Дагэтуль няма адзінага меркавання адносна агульнай колькасці кафедраў Інбелкульта напрыканцы яго існавання. Розныя аўтары па-рознаму падыходзяць да вырашэння гэтага пытання. Паводле нашых падлікаў гэтую колькасць можна вызначыць 16 кафедрамі. Няпэўнасць арганізацыйнай будовы і актыўныя пошукі аптымальнай структуры, якая б найбольш адпавядала задачам развіцця навуковага комплексу рэспублікі, што ствараўся, абумовілі яе частыя змены. Магчыма, гэтым тлумачацца некаторыя разыходжанні, што маюць месца і ў навуковай літаратуры і ў архіўных матэрыялах, на стане якіх да таго ж адбіліся як спосабы іх стварэння, так і ступень захаванасці. Няма адзінага меркавання адносна агульнай колькасці кафедраў Інбелкульта напрыканцы яго існавання.

Перыядычныя структурныя перабудовы мелі на мэце пашырэнне і аптымізацыю навукова-даследчай працы ў рэспубліцы. Як сведчаць даследаванні і дакументальныя матэрыялы, менавіта з другой паловы 1920-х гг. Інбелкульт пачынае ўсё больш упэўнена заяўляць пра сябе як беларускі цэнтр навуковай думкі. Няўдалая спроба арганізацыі Акадэміі навук да дзесяцігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі мела і станоўчы бок – наданне Інбелкульту акадэмічнага статуту. З сакавіка 1928 г. думка аб своечасовасці рэарганізацыі ІБК у АН, адзначаў У. М. Ігнатоўскі, «будзе спатыкацца цяпер часта, як на Беларусі, так і ў СССР». І далей: «Паступова яна ўсё больш і больш будзе пашырацца і захапліваць як партыйную, так і беспартыйную грамадскасць» [78, с. 24]. Пры такім развіцці падзей пераўтварэнне – перайменаванне, як тады часта пісалі, ІБК у БелАН станавілася справай часу. Нагодай для яго даволі хуткага набліжэння стаў 10-гадовы юбілей заснавання БССР.

### Літаратура і крыніцы


1. Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Мн., 1927.
2. Кароткая інфармацыя аб дзейнасці Інстытута Беларускае Культуры // Бюллетень СНК БССР. – 1926. – № 8. – С. ІІ.
3. *Ігнатоўскі, У.* Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12.
4. Академический центр Наркомпроса ССРБ // Вестник Наркомпроса ССРБ. – 1921. – № 2.
5. *Мяснікоў, А. Ф.* Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А. Ф. Мяснікоў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск, 2009. – 344 с.
6. Организация науки в первые годы Советской власти (1917–1925 гг.) : сб. док. / сост.: М. С. Бастракова [и др.] ; редкол.: К. В. Островитянов [и др.]. – Л. : Наука, 1968. – 419 с.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 516. Арк. 9–9 адг.; Спр. 519. Арк. 34; Петрыкаў, П. Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П. Ц. Петрыкаў // Весці АНБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6.
8. С. Н. Інстытут Беларускай Культуры / С. Н. // Адраджэньне. – 1922. – Сш. 1.
9. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519.
10. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519.
11. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 514.
12. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519; Петрыкаў, П. Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П. Ц. Петрыкаў // Весці АНБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6.
13. *Петрыкаў, П. Ц.* Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П. Ц. Петрыкаў // Весці АНБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6.
14. *Петрыкаў, П. Ц.* Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П. Ц. Петрыкаў // Весці АНБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6.
15. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 516. Арк. 4 ; Петрыкаў, П. Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П. Ц. Петрыкаў // Весці АНБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. № 5–6.
16. *Богатырова, Л. А.* Культурное развитие Дагестана в 20-е годы XX в. / Л. А. Богатырова. – Режым доступа: lib.rudn.ru/avtoreferaty/Bogatyrova.pdf. – Дата доступа: 06.10.2011.
17. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519. Арк. 40; Петрыкаў, П. Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў.
18. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 100.
19. *Каранеўскі, І.* Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) / І. Каранеўскі // Наш край. – 1927. – № 10; Пічэта, У. І. Савецкая ўлада і пытаньне аб адчыненьні унівэрсытэту на Беларусі / У. І. Пічэта // Пытаньне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. – Мінск, 1991. – 48 с.
20. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519, арк. 40; Петрыкаў, П. Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў.
21. Стэнаграфічны запіс трэцяе сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР VI склікаць ня (2–5 ліст. 1924 г.). – Мінск, 1924.
22. В Народном комиссариате просвещения // Вестник Наркомпроса ССРБ. – 1921. – № 2.
23. *Ігнатоўскі, У.* Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12.


### References


1. Belorusskaya Sovetskaya Socialisticheskaya Respublika. – Mn., 1927.
2. Karotkaya infarmacyya ab dzejnasci Instytuta Belaruskae Kul'tury // Byulleten' SNK BSSR. – 1926. – № 8. – S. II.
3. *Ignatouski, U.* Staronka z gistoryi kul'turnaga budaunictva u BSSR / U. Ignatoўski // Bal'shavik Belarusi. – 1928. – № 12.
4. Akademicheskij centr Narkomprosa SSRB // Vestnik Narkomprosa SSRB. – 1921. – № 2.
5. *Myasnikoў, A. F.* Sto asob belaruskaj gistoryi: gistarychnyya partrety / A. F. Myasnikoў. – 2-e vyd., daprac. – Minsk, 2009. – 344 s.
6. Organizaciya nauki v pervye gody Sovetskoj vlasti (1917–1925 gg.) : sb. dok. / sost.: M. S. Bastrakova [i dr.] ; redkol.: K. V. Ostrovityanov [i dr.]. – L. : Nauka, 1968. – 419 s.
7. Nacyyanal'ny arhiu Respubliki Belarus' (dalej – NARB). – F. 42. Vop. 1. Spr. 516. Ark. 9–9 adg.; Spr. 519. Ark. 34; Petrykau, P. C. Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadou / P. C. Petrykaў // Vesci ANB. – Ser. gumanitar. navuk. – 1992. – № 5–6.
8. S. N. Instytut Belaruskaj Kul'tury / S. N. // Adradzhen'ne. – 1922. – Ssh. 1.
9. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 519.
10. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 519.
11. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 514.
12. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 519; Petrykaў, P. C. Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadoў / P. C. Petrykaў // Vesci ANB. – Ser. gumanitar. navuk. – 1992. – № 5–6.
13. *Petrykau, P. C.* Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadou / P. C. Petrykau // Vesci ANB. – Ser. gumanitar. navuk. – 1992. – № 5–6.
14. *Petrykau, P. C.* Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadou / P. C. Petrykau // Vesci ANB. – Ser. gumanitar. navuk. – 1992. – № 5–6.
15. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 516. Ark. 4 ; Petrykaў, P. C. Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadou / P. C. Petrykau // Vesci ANB. – Ser. gumanitar. navuk. – 1992. № 5–6.
16. Bogatyrova, L. A. Kul'turnoe razvitie Dagestana v 20-e gody HH v. / L. A. Bogatyrova. – Rezhym dostupa: lib.rudn.ru/avtoreferaty/Bogatyrova.pdf. – Data dostupa: 06.10.2011.
17. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 519. Ark. 40; Petrykau, P. C. Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadou.
18. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 100.
19. Karaneuski, I. Instytut belaruskaj kul'tury (Inbelkul't) / I. Karaneuski // Nash kraj. – 1927. – № 10; Picheta, U. I. Saveckaya ulada i pytan'ne ab adchynen'ni universytetu na Belarusi / U. I. Picheta // Pytan'ne ab vyshejshaj shkole na Belarusi ў minulym. – Minsk, 1991. – 48 s.
20. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 519, ark. 40; Petrykaў, P. C. Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadoў.
21. Stenagrafichny zapis trecyae sesii Central'naga Vykanaўchaga Kamitetu BSSR VI sklikan'nya (2–5 list. 1924 g.). – Minsk, 1924.
22. V Narodnom komissariate prosveshcheniya // Vestnik Narkomprosa SSRB. – 1921. – № 2.
23. *Ignatouski, U.* Staronka z gistoryi kul'turnaga budaўnictva ў BSSR / U. Ignatoўski // Bal'shavik Belarusi. – 1928. – № 12.

24. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519; Спр. 513; Спр. 152.
25. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 9.
26. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 121.
27. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 121.
28. С. Н. Інстытут Беларускай Культуры // Вестник Наркомпроса ССРБ. – 1922. – № 3–4.
29. НАРБ. Ф. – 4п. Воп. 1. Спр. 1166; Спр. 1088.
30. Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэволюцыйнага руху. – Мн., 1924, дадатак. – 322 с.
31. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 121.
32. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (далей – ЦНА НАНБ) – Ф. 67. Спр. 4.
33. ЦНА НАНБ. – Ф. 67. Спр. 13.
34. ЦНА НАНБ. – Ф. 67. Спр. 23.
35. Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Минск, 1927. – 528 с.; Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт). – Мн., 1926. – 118 с.
36. *Лыч, Л.* Паслярэвалюцыйнае нацыянальна-культурнае адраджэнне: дасягненні, супярэчнасці, абрыў (1917 – пачатак 30-х гг.) / Л. Лыч // Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск, 1996. – Гл. 5.
37. *Вабішчэвіч, А. М.* Гісторыя культуры Беларусі : вучэб.-метад. комплекс / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2016. – 194 с.
38. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 275.
39. Научные работники Белорусской Социалистической Советской Республики. Справочник. – Мінск, 1927; НАРБ. – Ф. 306. Воп.1. Спр. 151; Спр. 237; Спр. 275; Спр. 281.
40. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 100.
41. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 535.
42. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1166; Спр. 1168; Спр. 1169.
43. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 535; Петрыкаў, П. Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў.
44. Палажэньне аб ІБК : пастанова ЦВК і СНК БССР, 25 ліп. 1924 г. // ЗЗ БССР. Аддз. І. 1924. № 18.
45. Інстытут беларускай культуры. Мінск, 1993.
46. ЦНА НАНБ. – Ф. 67. Спр. 8.
47. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1285.
48. ЦНА НАНБ. – Ф. 67. Спр. 12.
49. Аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускае Культуры: пастанова НКА БССР, 16 студз. 1925 г. // Абвесьнік НКА БССР. – 1925. – № 4.
50. *Шчарбакоў, В. К.* Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі / В. К. Шчарбакоў. – Менск, 1934. – 50 с.
51. *Гринбаум, А.* Еврейская наука и научные учреждения в Советском Союзе. 1918–1953 / А. Грінбаум // Евреи в России. Историографические очерки. 2-я половина XIX века – XX век. – М. ; Иерусалим, 1994. – 180 с.
52. *Д. Анастасьин, И. Вознесенский* [Перченок Ф. Ф.]. Начало трех национальных академий // Память. Исторический сборник. М., 1981; Париж : La Presse Libre, 1982. Вып. 5.
53. *Гарэцкі, Р.* Бальшавіцкія рэпрэсіі супрацоўнікаў Беларускай акадэміі навук / Р. Гарэцкі // Репрессивная политика Советской власти : сб. науч. раб. – Минск, 2007. – № 2. – Рэжым доступу: http://jewishfreedom.org/page403.html. – Дата доступу: 15.11.2009.
54. Аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускае Культуры : пастанова СНК БССР, 12 лютага 1926 г. // ЗЗ БССР. Аддз. І. 1926. № 51.
55. Статут Інстытуту Беларускай Культуры : паст. СНК БССР, 29 чэрв. 1927 г. // ЗЗ БССР. Аддз. І. 1927. № 31.

24. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 519; Spr. 513; Spr. 152.
25. NARB. – F. 306. Vop. 1. Spr. 9.
26. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 121.
27. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 121.
28. S. N. Instytut Belaruskaj Kul'tury // Vestnik Narkomprosa SSRB. – 1922. – № 3–4.
29. NARB. F. – 4p. Vop. 1. Spr. 1166; Spr. 1088.
30. Belarus'. Narysy gistoryi, ekanomiki, kul'turnaga i revolyucyjnaga ruhu. – Mn., 1924, dadatak. – 322 s.
31. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 121.
32. Central'ny navukovy arhiŭ NAN Belarusi (dalej – CNA NANB) – F. 67. Spr. 4.
33. CNA NANB. – F. 67. Spr. 13.
34. CNA NANB. – F. 67. Spr. 23.
35. Belorusskaya Sovetskaya Socialisticheskaya Respublika. – Minsk, 1927. – 528 s.; Instytut Belaruskae Kul'tury (Inbelkul't). – Mn., 1926. – 118 s.
36. *Lych, L.* Paslyarevalyucyjnae nacyyanal'na-kul'turnae adradzhenne: dasyagnenni, supyarechnasci, abryŭ (1917 – pachatak 30-h gg.) / L. Lych // Gistoryya kul'tury Belarusi. – Minsk, 1996. – Gl. 5.
37. *Vabishchevich, A. M.* Gistoryya kul'tury Belarusi : vucheb.-metad. kompleks / A. M. Vabishchevich. – Brest : BrDU, 2016. – 194 s.
38. NARB. – F. 306. Vop. 1. Spr. 275.
39. Nauchnye rabotniki Belorusskoj Socialisticheskoj Sovetskoj Respubliki. Spravochnik. – Minsk, 1927; NARB. – F. 306. Vop.1. Spr. 151; Spr. 237; Spr. 275; Spr. 281.
40. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 100.
41. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 535.
42. NARB. – F. 4p. Vop. 1. Spr. 1166; Spr. 1168; Spr. 1169.
43. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 535; Petrykaŭ, P. C. Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadoŭ.
44. Palazhen'ne ab IBK : pastanova CVK i SNK BSSR, 25 lip. 1924 g. // ZZ BSSR. Addz. I. 1924. № 18.
45. Instytut belaruskaj kul'tury. Minsk, 1993.
46. CNA NANB. – F. 67. Spr. 8.
47. NARB. – F. 4p. Vop. 1. Spr. 1285.
48. CNA NANB. – F. 67. Spr. 12.
49. Ab rearganizacyi Instytutu Belaruskae Kul'tury: pastanova NKA BSSR, 16 studz. 1925 g. // Abves'nik NKA BSSR. – 1925. – № 4.
50. *Shcharbakoŭ, V. K.* Klasavaya barac'ba i gistarychnaya navuka na Belarusi / V. K. Shcharbakoŭ. – Mensk, 1934. – 50 s.
51. *Grinbaum, A.* Evrejskaya nauka i nauchnye uchrezhdeniya v Sovetskom Soyuze. 1918–1953 / A. Grinbaum // Evrei v Rossii. Istoriograficheskie ocherki. 2-ya polovina XIX veka – XX vek. – M. ; Ierusalim, 1994. – 180 s.
52. *D. Anastas'in, I. Voznesenskij* [Perchenok F. F.]. Nachalo tryoh nacional'nyh akademij // Pamyat'. Istoricheskij sbornik. M., 1981; Parizh : La Presse Libre, 1982. Vyp. 5.
53. *Garecki, R.* Bal'shavickiya represii supracoŭnikaŭ Belaruskaj akademii navuk / R. Garecki // Repressivnaya politika Sovetskoj vlasti : sb. nauch. rab. – Minsk, 2007. – № 2. – Rezhym dostupu: http://jewishfreedom.org/page403.html. – Data dostupu: 15.11.2009.
54. Ab rearganizacyi Instytutu Belaruskae Kul'tury : pastanova SNK BSSR, 12 lyutaga 1926 g. // ZZ BSSR. Addz. I. 1926. № 51.
55. Statut Instytutu Belaruskaj Kul'tury : past. SNK BSSR, 29 cherv. 1927 g. // ZZ BSSR. Addz. I. 1927. № 31.

56. *Ігнатоўскі, У.* Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12.
57. НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 3034.
58. Аб Інстытуце Беларускае Культуры: пастанова СНК БССР, 10 ліпеня 1926 г. // ЗЗ БССР. – 1926. – № 29.
59. *Ігнатоўскі, У.* Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12.
60. *Петрыкаў, П. Ц*. Стварэнне і дзейнасць Інстытута беларускай культуры / П. Ц. Петрыкаў, М. У. Токараў, М. І. Галенчык // Ін-т беларус. Культуры / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.
61. *Токараў, М.* Нараджэнне Беларускай Акадэміі навук / М. Токараў // Штогоднік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук ; рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. Падобны падыход, але з іншымі акцэнтамі можна сустрэць у Г. Нямігі. Паводле яго меркавання таксама існавалі дзве групы. Першая – «сьвядомы беларускі актыў», згрупаваны ў ІБК, які адцягваў пераўтварэнне ў БАН, таму што пачнецца «апаноўваньне ... бальшавіцкімі элементамі, з насаджэньнем бальшавіцка-русіфікацыйнага зьместу ... дзейнасьці ўстановы...» Другая – нацыянал-бальшавікі, згрупаваная ва ўрадавых колах, – прыспешвала такое пераўтварэнне: Няміга, Г. Інстытут беларускай культуры – Беларуская Акадэмія навук – Акадэмія навук Беларускай ССР / Г. Няміга. – Мюнхен, 1957. – 262 с.
62. *Токараў, М.* Усевалад Ігнатоўскі і стварэнне Беларускай акадэміі навук / М. Токараў // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 4.
63. НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 3034.
64. ЦНА НАНБ. – Ф. 67. Спр. 9.
65. *Фядосік, А. С.* Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы» ў гісторыі фалькларыстыкі 20–30-х гг. / А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991.
66. *Ігнатоўскі, У.* Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12.
67. Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Минск : Изд. СНК БССР, 1927. – 528 с.; НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 321.
68. Інстытут беларускай культуры / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск, 1993.
69. ЦНА НАНБ. – Ф. 67. Спр. 12.
70. *Токараў, М.* Усевалад Ігнатоўскі і стварэнне Беларускай акадэміі навук / М. Токараў // Беларус. гіст. часоп. 2006. – № 4.
71. Статут Інстытуту Беларускай Культуры: пастанова СНК БССР, 29 чэрв. 1927 г. // ЗЗ БССР. Аддз. І. 1927. № 31.
72. *Перченок, Ф. Ф.* «Дело Академии наук» и «великий перелом» в советской науке / Ф. Ф. Перченок // Трагические судьбы: репрессированные ученые Академии наук СССР. – М. : Наука, 1995. – С. 201–235. – Режим доступа: http://russcience.chat.ru/perch95f.htm. – Дата доступа: 25.01.2005.
73. *Аксёнов, Г. П.* Академия наук и власть: Третье столетие / Г. П. Аксёнов // Российская Академия наук: 275 лет служения России / Г. П. Аксёнов [и др.] ; редкол.: В. М. Орел (отв. ред.) [и др.]. – М. : Янус-К, 1999.

56. *Ignatoŷski, U.* Staronka z gistoryi kul'turnaga budaŷnictva ŷ BSSR / U. Ignatoŷski // Bal'shavik Belarusi. – 1928. – № 12.
57. NARB. – F. 4-p. Vop. 1. Spr. 3034.
58. Ab Instytuce Belaruskae Kul'tury: pastanova SNK BSSR, 10 lipenya 1926 g. // ZZ BSSR. – 1926. – № 29.
59. Ignatoŷski, U. Staronka z gistoryi kul'turnaga budaŷnictva ŷ BSSR / U. Ignatoŷski // Bal'shavik Belarusi. – 1928. – № 12.
60. *Petrykaŷ, P. C.* Stvarenne i dzejnasc' Instytuta belaruskaj kul'tury / P. C. Petrykaŷ, M. U. Tokaraŷ, M. I. Galenchyk // In-t belarus. Kul'tury / M. P. Kascyuk [i insh.] ; redkal.: M. A. Barysevich [i insh.]. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1993. – 255 s.
61. *Tokaraŷ, M.* Naradzhenne Belaruskaj Akademii navuk / M. Tokaraŷ // Shtogodnik Instytuta gistoryi Nacyyanal'naj akademii navuk ; redkal.: M. P. Kascyuk (gal. red.) [i insh.]. – Minsk, 1999. Padobny padyhod, ale z inshymi akcentami mozhna sustrec' u G. Nyamigi. Pavodle yago merkavannya taksama isnavali dzve grupy. Pershaya – «s'vyadomy belaruski aktyŷ», zgrupavany ŷ IBK, yaki adcyagvaŷ peraŷtvarenne ŷ BAN, tamu shto pachnecca «apanoŷvan'ne ... bal'shavickimi elementami, z nasadzhen'nem bal'shavicka-rusifikacyjnaga z'mestu ... dzejnas'ci ŷstanovy...» Drugaya – nacyyanal-bal'shaviki, zgrupavanaya va ŷradavyh kolah, – pryspeshvala takoe peraŷtvarenne: Nyamiga, G. Instytut belaruskaj kul'tury – Belaruskaya Akademiya navuk – Akademiya navuk Belaruskaj SSR / G. Nyamiga. – Myunhen, 1957. – 262 s.
62. *Tokaraŷ, M.* Usevalad Ignatoŷski i stvarenne Belaruskaj akademii navuk / M. Tokaraŷ // Belarus. gist. chasop. – 2006. – № 4.
63. NARB. – F. 4-p. Vop. 1. Spr. 3034.
64. CNA NANB. – F. 67. Spr. 9.
65. *Fyadosik, A. S.* Ilyuzornasc' i sapraŷdnasc': «Belyya plyamy» ŷ gistoryi fal'klarystyki 20–30-h gg. / A. S. Fyadosik. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1991.
66. *Ignatoŷski, U.* Staronka z gistoryi kul'turnaga budaŷnictva ŷ BSSR / U. Ignatoŷski // Bal'shavik Belarusi. – 1928. – № 12.
67. Belorusskaya Sovetskaya Socialisticheskaya Respublika. – Minsk : Izd. SNK BSSR, 1927. – 528 s.; NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 321.
68. Instytut belaruskaj kul'tury / M. P. Kascyuk [i insh.] ; redkal.: M. A. Barysevich [i insh.]. – Minsk, 1993.
69. CNA NANB. – F. 67. Spr. 12.
70. *Tokaraŷ, M.* Usevalad Ignatoŷski i stvarenne Belaruskaj akademii navuk / M. Tokaraŷ // Belarus. gist. chasop. 2006. – № 4.
71. Statut Instytutu Belaruskaj Kul'tury: pastanova SNK BSSR, 29 cherv. 1927 g. // ZZ BSSR. Addz. I. 1927. № 31.
72. *Perchenok, F. F.* «Delo Akademii nauk» i «velikij perelom» v sovetskoj nauke / F. F. Perchenok // Tragicheskie sud'by: repressirovannye uchenye Akademii nauk SSSR. – M. : Nauka, 1995. – S. 201–235. – Rezhym dostupa: http:// russcience.chat.ru/perch95f.htm. – Data dostupa: 25.01.2005.
73. *Aksyonov, G. P.* Akademiya nauk i vlast': Tret'e stoletie / G. P. Aksyonov // Rossijskaya Akademiya nauk: 275 let sluzheniya Rossii / G. P. Aksyonov [i dr.] ; redkol.: V. M. Orel (otv. red.) [i dr.]. – M. : Yanus-K, 1999.

74. *Князев, Г. А.* Академия наук СССР / Г. А. Князев, А. В. Кольцов, Б. В. Левшин // Советская ист. энцикл. : в 16 т. – М., 1961. – Т. 1.
75. Наука и кризисы. Историко-сравнительные очерки / Э. И. Колчинский [и др.] ; ред.-сост. Э. И. Колчинский. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2003. – 1040 с.
76. *Петрыкаў, П. Ц*. Стварэнне і дзейнасць Інстытута беларускай культуры / П. Ц. Петрыкаў, М. У. Токараў, М. І. Галенчык // Ін-т беларус. культуры / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск, 1993.
77. *Петрыкаў, П. Ц.* Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў // Весці АНБ. Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6. – С. 66 ; ЦНА НАНБ. – Ф. 67. Спр. 23.
78. *Ігнатоўскі, У.* Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12.

74. *Knyazev, G. A*. Akademiya nauk SSSR / G. A. Knyazev, A. V. Kol'cov, B. V. Levshin // Sovetskaya ist. encikl. : v 16 t. – M., 1961. – T. 1.
75. Nauka i krizisy. Istoriko-sravnitel'nye ocherki / E. I. Kolchinskij [i dr.] ; red.-sost. E. I. Kolchinskij. –SPb. : Dmitrij Bulanin, 2003. – 1040 s.
76. Petrykau, P. C. Stvarenne i dzejnasc' Instytuta belaruskaj kul'tury / P. C. Petrykau, M. U. Tokarau, M. I. Galenchyk // In-t belarus. kul'tury / M. P. Kascyuk [i insh.] ; redkal.: M. A. Barysevich [i insh.]. – Minsk, 1993.
77. *Petrykaŭ, P. C.* Instytutu belaruskaj kul'tury – 70 gadoŭ // Vesci ANB. Ser. gumanitar. navuk. – 1992. – № 5–6. – S. 66 ; CNA NANB. – F. 67. Spr. 23.
78. *Ignatoŭski, U.* Staronka z gistoryi kul'turnaga budaŭnictva ŭ BSSR / U. Ignatoŭski // Bal'shavik Belarusi. – 1928. – № 12.

УИЦ БГПУ